# У ПОШУКАХ НОВАГА ГУМАНІЗМУ: ВОБРАЗ ВОРАГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРА ДРУГУЮ СУСВЕТНУЮ ВАЙНУ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

**М. А. Курыпка**

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, вул. Захарава, 21, 220034, г. Мінск, Беларусь, kuripych@gmail.com*

У дакладзе разглядаецца асэнсаванне вобраза ворага беларускімі пісьменнікамі канца XX – пачатку XXI ст. Выяўлена, што ў сучаснай ваеннай прозе назіраецца размыванне «двухузроўневага» супрацьпастаўлення «свой – чужы», «добры – злы». Даказана, што творчасць А. Адамовіча, В. Быкава, А. Брава і іншых пераасэнсоўвае ўсталяваную персанажную сістэму «свае – добрыя, ворагі – дрэнныя» і рэпрэзентуе асэнсаванне вобраза ворага праз такія канцэпты, як гуманізм і агульначалавечая этыка.

***Ключавыя словы:*** беларуская літаратура; Другая сусветная вайна; вобраз ворага; стэрэатып; свой – чужы; гуманістычная парадыгма.

Напрыканцы XX ст. Другая сусветная вайна працягвала заставацца вострай і актуальнай тэмай, на спецыфічным жыццёвым матэрыяле якой пісьменнікі вынаходзілі рашэнне ідэйных і эстэтычных праблем мінулага і сучаснасці. Разам з тым у беларускай ваеннай прозе з'явіліся адносна новыя распрацоўкі ў светаўспрыманні гісторыі. Тыповым прыкладам гэтага сталі абвостраныя пытанні аб адносінах паміж «сваімі і чужымі», аб пошуках знешняга і ўнутранага ворага.

Па словах З. Траццяк, ужо ў творчасці М. Гарэцкага адчувалася, што на вайне «разбураецца стэрэатыпнае мысленне: апазіцыя “свой – чужы / мы – яны” не спрацоўвае» [1, с. 42]. Ужо падчас Першай сусветнай вайны назіралася несупадзенне афіцыйна-прапагандысцкай нянавісці да ворага і адносін да яго, як да сабе падобнага (варта ўзгадаць славутыя «братанні» на абодвух франтах). Заканамерна, што ў канцы XX ст., пасля доўгага прыглушэння гэтай тэмы, аднавіліся пошукі ў стварэнні сапраўднай, праўдзівай і шчырай гісторыі, дзе ўзаемаадносіны «сваіх і чужых» пачалі набываць новыя адценні.

Справядліва, што пры ўсёй балючай памяці вайны было вельмі цяжка ўявіць існаванне «чалавечнага» ворага ці звярнуць больш пільную ўвагу на свае асабістыя недахопы, але з цягам часу боль пачуццяў паступова змянялі новыя гістарычныя факты і раскрыццё невядомых старонак вайны. Гэта дазволіла звярнуцца не толькі да вобраза відавочнага ворага, які мог уяўляць сабой выключнае зло, але і да пошукаў прыроды нацызму і схільнасці да гвалту ўнутры кожнага, незалежна ад яго нацыянальнай ці ідэалагічнай прыналежнасці.

Пачынаючы з адной з першых непадцэнзурных аповесцей 1990-х гг. «Ахвяры» (1990) І. Шамякіна, сучасная беларуская проза актыўна звярнулася да адраджэння раней забароненых пытанняў або тых тэм, якія лічыліся неэтычнымі. Такія тэмы, як сталінізм, «свой – чужы», калабаранты, штрафныя батальёны, адносіны з органамі ўлады на вызваленых тэрыторыях і супярэчлівая партызанская дзейнасць, сталі асновай творчасці В. Карамазава, В. Адамчыка, В. Быкава, А. Адамовіча, І. Чыгрынава, І. Шамякіна і інш. Гэта прывяло да трансфармацыі агульнапрынятага ўяўлення вайны, што стварала новую нацыянальную памяць.

Іншымі словамі, беларускія пісьменнікі адмовіліся ад маўчання ў дачыненні да невыносных злачынстваў, правалаў і супярэчнасцей Вялікай Айчыннай вайны, а ў сучаснай ваеннай прозе ўзнікла новае стаўленне да вобраза ворага: з аднаго боку, яно пазбаўлена відавочнага падзелу на «белае і чорнае», а з другога – варожымі якасцямі надзяляюцца тыя сілы, якія раней і нават сёння не ўспрымаюцца негатыўна.

Пераасэнсаванне вобраза ворага, адыход ад схематычнага малюнка мінулага і адназначнай трактоўкі гісторыі можна выразна прасачыць у позняй творчасці В. Быкава. Напрыклад, у аповесці «Пакахай мяне, салдацік» (1996) многія савецкія салдаты і афіцэры паўстаюць у жорстка адкрытым святле. Пісьменнік звяртаецца да тэмы марадзёрства і гвалту ў адносінах да мясцовага насельніцтва ў Германіі і Аўстрыі – непрывабныя з’явы, якія часцей за ўсё абміналіся савецкімі пісьменнікамі і гісторыкамі.

Галоўны герой – артылерыст з горыччу заўважае такія моманты, ад якіх яму робіцца сумна: *Нашы салдаты з машын зларадна крычалі ім: «Гітлер капут!» Немцы, амаль не рэагуючы на выпады ўчорашніх ворагаў, тупалі сабе далей. Тады нашы хітруны, ускідваючы руку, сталі гарлапаніць звыклае для немцаў «хайль Гітлер!». І некаторыя з немцаў, напэўна па звычцы, нерашуча адказвалі ім «хайль», машынальна падымаючы руку. Ледзь з рукавоў на запясцях паказвалася папружка ад гадзінніка, нашы стукалі аб верх кабіны, шафёр тармазіў, хтосьці саскокваў на дарогу і кідаўся да немцаў. Праз хвіліну з’яўляўся з гадзіннікамі, а то і двума ў руках і ўжо на хаду чапляўся за борт «студэбеккераў»* [2, с. 482].

Дзяўчына Франя, з якой галоўны герой сустрэнецца на пастоі ў адным з аўстрыйскіх гарадкоў, была сагнана на работы ў Рэйх. Раней яна была вымушана дэзертыраваць з партызанскага атрада з прычыны нестатутных адносін з камандаваннем, а менавіта дамагання сексуальнага плана. «*Што ж такога – ля калодзежа жыць і вады не напіцца?*» [2, с. 469], – сцвярджаў намеснік камандзіра Кашэльнікаў.

Франя з’яўляецца глыбока трагічнай фігурай, быццам бы страчанай у прасторы: яна не проста працавала на гаспадара – яна была, па сутнасці,

здрадніцай, а значыць, была нікому не патрэбнай на радзіме. Можа быць, менавіта таму пісьменнік забівае сваю гераіню, каб вырашыць супярэчнасць і не дапусціць здзеку з разгубленай душы, які б абавязкова адбыўся, калі б дзяўчына была арыштаваная.

Цікава, што на кантрасце з часта неадэкватнымі афіцэрамі, «смершаўцамі» і простымі салдатамі вобраз ворага набывае цалкам чалавечыя рысы. Франя вельмі станоўча адклікаецца аб сям'і Шарфераў, якая прыняла яе, асабліва аб іх сыне: *А той танкіст быў іх сын лейтэнант Курт Шарф. Дома ён зусім іншым апынуўся – ціхі, ветлівы. Толькі вельмі сумны, быццам нешта прадчуваў. Праз два дні паехаў на фронт, а праз два тыдні загінуў у танку. Калі падумаць, ён мяне выратаваў. Інакш загінула б я на той іх хіміі* [2, с. 464]. Падобная характарыстыка немца не была ўласцівая ваеннай прозе папярэдніх этапаў, калі вобраз ворага проста не мог мець чалавечага твару і заслугоўваць да сябе станоўчых адносін.

Позняя творчасць В. Быкава падпарадкоўваецца не толькі даследаванню праблемы маральнага выбару як сродку самарэалізацыі асобы, што назіраецца ў шматлікай крытыцы савецкага часу, але і іншай задачы – барацьбе за агульначалавечыя каштоўнасці і захоўванню «маральна-этычных сіл у стракатым сучасным свеце» [3, с. 126]. Ва ўмовах такой парушанай рэчаіснасці вораг набывае іншы статус, а свае робяцца ворагамі. В. Быкаў звяртаецца ўжо да вобраза пэўнага асобнага чалавека, да яго разбуранай ці, наадварот, вызваленай ад гнёту душы, бо «менавіта тут пытанне “быць ці не быць” вырашаецца ў абсалютнай мяжы чалавечай, нацыянальнай экзістэнцыі» [40, с. 201].

Няцяжка здагадацца, што выразнае падзяленне на «сваіх і чужых» давала магчымасць больш выразна падкрэсліць характар станоўчага героя. Раскрыццё характару ворага дапамагала атрымаць маральную перамогу над захопнікам і абуджала пачуццё справядлівага змагання. Але, калі ў сярэдзіне ХХ ст. пісьменнікі праз сваіх герояў хацелі, па словах А. Адамовіча, зразумець усю праўду і знайсці тую глебу, на якой «растуць атрутныя расліны жорсткасці і катаўскай паслухмянасці фашысцкай дактрыне» [5, с. 37], то ўжо ў сучаснай літаратуры назіраецца паслабленне стэрэатыпізацыі «свой – чужы, сябар – вораг, дрэнны – добры».

Відавочная «гуманізацыя» вобраза ворага выяўляецца ў творы А. Адамовіча «Нямко» (1993), у цэнтры якога знаходзяцца лёс і характары людзей, якія апынуліся па розныя бакі фронту: беларуская дзяўчына Паліна і Франц, малады салдат аднаго з падраздзяленняў СС.

Франц знаходзіцца ў складзе групы, мэтай якой з'яўляецца знішчэнне вёскі, дзе яны расквартараваны. Закахаўшыся ў маладую дзяўчыну Паліну, салдат вымушаны дэзертыраваць і пусціцца ў бязмэтныя пошукі мірнага жыцця разам са сваёй каханай. У вобразе Франца А. Адамовіч бачыць не

ворага-забойцу, а *дылду-хлапца, які не можа з уласнымі рукамі-нагамі справіцца, падобны да ястрабяня, што вывалілася з гнязда. ‹...› Без смеху глянуць на яго нельга. І ўвесь час бачыш яго блакітныя вочы. Нават спіной адчуваеш* [6, с. 11].

Вельмі кантрасна Адамовіч апісвае ў кнізе «свайго» камісара партызанскага атрада: *Тут Франц блізка разгледзеў чалавека ў скуранцы, яго вузкі і непрыгожы твар, воўчыя зморшчакі на пераноссі. Нешта знаёмае падалося яму ў бессэнсоўна-злым поглядзе, у рэзка апушчаных кутках белагубага роту. Менавіта такім лёгка падпарадкоўваюцца: злосць ад іх зыходзіць устойлівая, як атмасферны слуп. Яна і цябе пачынае спавіваць, спачатку непрыязнасцю да яго ж. Але затым ты сам зараджаешся яго незразумелай, незразумела да каго злосцю – ад неспакою, трывогі, страху* [6, с. 55].

Зрушваючы акцэнт з відавочнага аб’ектыўна-гістарычнага зместу, аўтар, выступаючы «хутчэй у ролі хірурга, чым тэрапеўта» [7, с. 379], хоча выказаць сваю ідэйную ацэнку рэчаіснасці як вынік агульных заканамернасцей жыццёвага працэсу: любові, дабрыні, радасці жыцця. Таму ў аповесці «Нямко» пісьменнік так жвава разбурае пэўныя стэрэатыпы, якія, на яго думку, аджылі сваё, адышлі ў мінулае і не даюць узняцца вышэй, да таго ўспрымання чалавека, якое мусіць быць характэрна «звышлітаратуры», што А. Адамовіч старанна ствараў.

Незвычайнай у кантэксце беларускай ваеннай прозы стала аповесць маладой журналісткі А. Брава «Дараванне» (2013). Беларуская імігрантка Ларыса вымушана даглядаць у Германіі хворага на Альцгеймера бацьку свайго мужа. Пакуты старога не праходзяць дарма, паступова жанчына даведваецца, што яе новы сваяк – былы салдат Вермахта, а хворы мозг абуджае ў душы Ганса ўспаміны, якія прымушаюць яго лічыць, што вайна яшчэ не скончылася.

Парадаксальна, але для Ларысы, сям’я якой пацярпела падчас вайны і, магчыма, ад вайсковай часткі, дзе служыў Ганс, звар’яцелы стары становіцца крыніцай выратавання веры ў чалавека, якой жанчыне так не хапала на чужыне. Уначы Ганс будзіць усіх дзіўным лямантам: *За што іх расстралялі? За што!?* [8, с. 40], а знойдзеныя абрыўкі яго дзённікаў (*Навошта мы прыйшлі на гэтую зямлю? Каб забіваць і быць забітымі?* [8, с. 61]) дазволілі Ларысе па-новаму ўбачыць тую вайну і трагедыю, якой яна абярнулася для ўсіх яе ўдзельнікаў.

Жанчыну шакіруе тая незвычайная праўда, што Ганс, будучы закаханым у беларускую дзяўчыну Зосю, рызыкаваў сваім жыццём і папярэдзіў яе аб набліжэнні рэйда карнікаў на вёску, але гэта было дарэмна. Жыхароў вёскі ўсё роўна знайшлі паліцаі і знішчылі, а боль гэтай трагедыі даймаў Ганса ўсё жыццё: *...вочы Зосі былі шырока адкрыты... і зусім пустыя... як*

*неба, якое ў іх адбівалася... чорнае ад дыму... мусіць, яна нават не паспела спалохацца... ці нешта ўспомніць... мне сказалі, гэта заслуга паліцэйскага з мясцовых, ён ведаў, як прабрацца на востраў у балоце, дзе жыхары вёскі звычайна хаваліся... потым я яго ўбачыў... вёрткі, з прылізанымі валасамі і маленькімі вусікамі, выпуклымі вочкамі колеру вадкай кавы... паліваў бензінам сцены адрыны... ён і сёння стаіць перад вачыма... я пакляўся сабе, што высачу яго... я не мог пакараць іх усіх, сваіх і чужых... але я мог забіць аднаго...* [8, с. 63].

Былы салдат вермахта становіцца нетрадыцыйным для беларускай літаратуры XX ст. вобразам ворага – адзіным носьбітам сапраўдных чалавечых пачуццяў у свеце, дзе даўно ўсё перавярнулася дагары нагамі. Таму галоўная гераіня знаходзіць у сабе сілы з сапраўдным хрысціянскім гуманізмам убачыць у былым ворагу простага сямнаццацігадовага хлопца, які, як і яе продкі, стаў трагічнай ахвярай вайны і заслугоўваў даравання.

У сучаснай ваеннай прозе акцэнт варожасці змясціўся з вобраза нямецкага салдата ці калабаранта, якім ніхто і не адмаўляў у належнасці «злога», на кожнага чалавека, у тым ліку і на «сваіх». На першым месцы аказваецца чалавек, не падрыхтаваны да вайны, з негераічнай свядомасцю, у свет якога ўрываецца непрымальны гвалт. Такім чынам, у беларускай літаратуры канца XX – пачатку XXI ст. і паняцце барацьбы набывае новае пашыранае значэнне. Гэта не толькі барацьба чалавека з ворагам ці з самім сабой у выключных абставінах, але і сутыкненне чалавека і «антычалавечага». Калі раней асноўным канфліктам у літаратуры традыцыйна з'яўлялася супрацьстаянне савецкага народа, які абараняе сваю радзіму ад фашызму, што выступаў галоўнай разбуральнай сілай, то зараз гэтай сілай стала не толькі канкрэтная дзяржава ці ідэалогія, а і сам чалавек як ён ёсць.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Траццяк З. І.* Вайна як эрзац-жыццё ў творах М. Гарэцкага і А. Гародні // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. 2014. № 10. С. 41–45.

2. *Быкаў В.* Пакахай мяне, салдацік: аповесці, апавяданні. Мінск : Маст. літ., 2013.

3. *Рагуля А. У.* Пафас станаўлення : літ.-крыт. арт. Мінск : Маст. літ., 1991.

4. *Афанасьеў І.* Апостальскі час: Васіль Быкаў у еўрапейскім кантэксце // Полымя. 1995. № 2. С. 200–211.

5. *Адамович А.* Ничего важнее: современные проблемы военной прозы. М. : Совет. писатель, 1985.

6. *Адамович А.* VIXI: Я прожил: повести, воспоминания, размышления. М. : Материк, 1994.

7. *Тычына М. А.* Народ і вайна. Мінск : Беларус. навука, 2015.

8. *Брава А.* Дараванне = Прощение = Vergebung: аповесць. Мінск : Звязда, 2013.